81.411.3
К19
ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ МОВАЗНАЎСТВА ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА

УДК 808.26 – 541.1

Кандраценя Ірына Уладзіміраўна

# НУЛЯВАЯ СУФІКСАЦЫЯ Ў СІСТЭМЕ БЕЛАРУСКАГА СЛОВАЎТВАРЭННЯ

10.02.01 – беларуская мова

**Аўтарэферат**
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

Навукова-
бібліяграфічны
аддзел

МІНСК, 2003

81.411.3-214
19

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Работа выканана ў аддзеле беларуска-рускіх моўных сувязей Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Навуковы кіраўнік – доктар філалагічных навук,
прафесар **Лукашанец А.А.**,
Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Афіцыйныя апаненты: доктар філалагічных навук
дацэнт **Прыгодзіч М.Р.**,
Беларускі дзяржаўны універсітэт,
кафедра гісторыі беларускай мовы

кандыдат філалагічных навук
**Кунцэвіч Л.П.**,
Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,
аддзел дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі

Апаніруючая арганізацыя – Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка

Абарона адбудзецца “23” снежня 2003 г. у $14^{00}$ на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.43.01 пры Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2.; тэл.: 284-15-94).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Аўтарэферат разасланы “22” лістапада 2003 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый Н.В. Паляшчук

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі**. Актуальнасць даследавання абумоўлена неабходнасцю расшырэння і ўдакладнення лінгвістычных уяўленняў пра сутнасць і спецыфіку нульсуфіксальнага спосабу ўтварэння назоўнікаў, удакладнення месца і ролі нулявой суфіксацыі ва ўмовах актывізацыі дэрывацыйных працэсаў, што адбываюцца ў сучаснай беларускай мове. Нягледзячы на тое, што беларускімі мовазнаўцамі ўстаноўлены дастаткова поўны корпус нульсуфіксальных назоўнікаў, у асноўным праведзена апісанне іх словаўтваральных значэнняў, яшчэ не даследаваны заканамернасці семантычнай суаднесенасці матывавальнага і матываванага слоў пры ўтварэнні нульсуфіксальных назоўнікаў, не выяўлены ў поўнай ступені роля і ўплыў граматычных характарыстык матывавальнай базы на фарміраванне семантычнай структуры нульсуфіксальнага слова, не ўстаноўлены ступень і ўмовы сістэмнасці адносін паміж структурнымі адзінкамі словаўтваральных пар нульсуфіксальнага спосабу ўтварэння назоўнікаў. Даследаванне названых аспектаў дазволіць дакладней вызначыць і спецыфіку нулявой суфіксацыі, і яе межы.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Дысертацыя выканана ў аддзеле беларуска-рускіх моўных сувязей Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі ў рамках Дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў “Даследаванне беларускай мовы, яе гісторыі, сучаснага стану, сувязей з іншымі славянскімі мовамі, распрацоўка гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнага літаратурнага працэсу (Беларуская мова і літаратура)” 2003 – 2005 гг.

**Мэта і задачы даследавання.** Асноўная мэта работы заключаецца ў вызначэнні лінгвістычнай сутнасці нулявой суфіксацыі з улікам апошніх даследаванняў, апісанні характару матывацыйных адносін паміж членамі словаўтваральных пар і ўстанаўленні межаў нульсуфіксальнага ўтварэння назоўнікаў у сучаснай беларускай мове. Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

- правесці аналіз сутнасці паняцця “нулявая суфіксацыя” ў сучаснай лінгвістычнай літаратуры;
- устанавіць крытэрыі для вызначэння напрамку матывацыі ў словаўтваральных парах пры нульсуфіксальным спосабе ўтварэння назоўнікаў;
- вызначыць асноўныя тыпы семантычнай суаднесенасці матывавальных аддзеяслоўных асноў і адпаведных дзеяслоўных нульсуфіксальных назоўнікаў;
- прааналізаваць адносіны катэгорыі трывання матывавальнага дзеяслова і семантыкі матываванага назоўніка;
- апісаць марфаналагічныя працэсы, якімі суправаджаецца нульсуфіксальнае ўтварэнне назоўнікаў;

*20504246*

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



- параўнаць структуру матывавальных асноў аддзеяслоўных нульсуфіксальных назоўнікаў і назоўнікаў на **-нн(е)** і **-к(а)** для акрэслення межаў нульсуфіксальнага словаўтваральнага тыпу;
- выявіць асаблівасці функцыянавання нульсуфіксальных назоўнікаў у сучаснай моўнай практыцы.

**Аб'ект і прадмет даследавання**. Аб'ектам даследавання з'яўляюцца назоўнікі, утвораныя нульсуфіксальным спосабам. Прадмет даследавання – структурна-семантычныя, матывацыйныя адносіны паміж дзеясловам і аддзеяслоўным нульсуфіксальным назоўнікам.

**Матэрыял даследавання** атрыманы метадам суцэльнай выбаркі са "Слоўніка беларускай мовы" пад рэд. М.В. Бірылы (Мн., 1987), "Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы" ў 5 тамах, 6 кнігах (Мн., 1977 – 1984), "Словаўтваральнага слоўніка сучаснай беларускай мовы" (Мн., 2000) (1125 лексічных адзінак), а таксама шляхам адвольнай выбаркі з газет "Наша слова", "Літаратура і мастацтва", часопісаў "Полымя", "Маладосць", "Спадчына", "Роднае слова" ў перыяд з 1993 па 2000 год (58 адзінак).

**Гіпотэза.** Актывізацыя працэсу нульсуфіксальнай дэрывацыі ў сучаснай беларускай мове абумоўлена не толькі экстралінгвістычнымі прычынамі, але і ўнутрымоўнымі фактарамі: дзякуючы шырокаму спектру лексічных значэнняў, нульсуфіксальныя ўтварэнні здольны абслугоўваць самыя розныя моўныя сферы (навуковую, публіцыстычную, гутарковую і інш.). Матываваныя нульсуфіксальныя адзінкі развіваюць сваю семантычную структуру на базе значэнняў матывавальнай асновы.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання**. Метадалагічнай асновай дысертацыі з'яўляюцца палажэнні тэорыі сінхроннага словаўтварэння аб фармальна-семантычнай суадноснасці базы і матываванага слова. Метады вызначаюцца мэтамі і задачамі, пастаўленымі ў рабоце, характарам матэрыялу. Даследаванне праведзена на падставе апісальнага і супастаўляльнага метадаў. Методыка даследавання заключаецца ў сумяшчэнні некалькіх відаў аналізу: словаўтваральнага, дэфініцыйнага (лексікаграфічнае апісанне матываваных слоў), праводзяцца аналогіі паміж дэрывацыйнымі мадэлямі. У рабоце выкарыстаны элементы колькаснага падліку.

**Навуковая навізна і вартасць атрыманых вынікаў**. У дысертацыі ўпершыню ў беларускім мовазнаўстве праведзена комплекснае даследаванне сутнасці нулявой суфіксацыі і яе месца ў сістэме сінхроннага словаўтварэння беларускай мовы; створана тыпалогія суадносін семантыкі нульсуфіксальных назоўнікаў з семантыкай базавых дзеясловаў; упершыню ў беларускім мовазнаўстве праведзена даследаванне сістэмы матывацыі аддзеяслоўных нульсуфіксальных назоўнікаў па наступных аспектах: вызначаны сувязі імён з дзеясловамі з улікам двайной матывацыі, апісана суаднесенасць катэгорыі трывання матывавальнага дзеяслова з лексічным значэннем матываванага назоўніка, устаноўлены найбольш прадуктыўныя матывавальныя дзеяслоўныя асновы, зроблена поўнае апісанне марфаналогіі нульсуфіксальнага спосабу словаўтварэння.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



**Практычная вартасць атрыманых вынікаў**. Вынікі праведзенага даследавання могуць быць выкарыстаны ў ВНУ пры выкладанні раздзела "Словаўтварэнне", пры распрацоўцы спецкурсаў і спецсемінараў, у лексікаграфічнай практыцы. Прынцыпы апісання матывацыйных адносін могуць быць выкарыстаны пры даследаванні іншых словаўтваральных тыпаў і спосабаў.

**Асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону.**

1. Нульсуфіксальны спосаб утварэння назоўнікаў з'яўляецца актыўным сродкам папаўнення слоўнікавага складу сучаснай беларускай мовы. З улікам словаўтваральнай семантыкі і характару марфаналагічных працэсаў гэты спосаб мэтазгодна разглядаць у межах суфіксальнага словаўтварэння.

2. Лексічнае значэнне базавага дзеяслова па-рознаму рэалізуецца ў семантыцы нульсуфіксальных назоўнікаў: семантычная структура матывавальнага слова поўнасцю суадносіцца з семантыкай матываванага назоўніка; семантычны аб'ём матываваных слоў можа быць шырэйшы або вузейшы за семантычны аб'ём матывавальных.

3. Семантычная структура аддзеяслоўных нульсуфіксальных назоўнікаў пацвярджае высновы даследчыкаў аб тэндэнцыі адыходу імя ад дзеяслова. Паміж асновамі, звязанымі словаўтваральнымі адносінамі, як правіла, не назіраецца тоеснасці лексічнага значэння.

4. Нульсуфіксальныя назоўнікі ўтвараюцца ад дзеясловаў закончанага і незакончанага трывання. Гэта сведчыць пра тое, што названая граматычная катэгорыя з'яўляецца нерэлевантнай для разглядаемага спосабу афіксальнага ўтварэння назоўнікаў у беларускай мове.

5. Марфаналогія нулявой суфіксацыі ў цэлым тая ж, што і пры суфіксальным спосабе словаўтварэння. Гэта даказвае правамернасць статуса нульсуфіксальнага спосабу ўтварэння назоўнікаў як аднаго з прадуктыўных афіксальных спосабаў словаўтварэння.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Дысертацыя з'яўляецца самастойным даследаваннем.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**. Вынікі даследавання апрабаваны на навуковай канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю акадэміка В.У. Вінаградава, на міжнародных навуковых канферэнцыях "Беларуска – руска – польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства" (Віцебск, 1994), "Словаўтварэнне і намінатыўная дэрывацыя ў славянскіх мовах" (Гродна, 1996), "Беларуская і руская мова ў Беларусі: праблемы функцыянавання і ўзаемадзеяння" (Мінск, 1997), "Мова – Літаратура – Культура" (Мінск, 1999), "Беларуская мова ў другой палове XX ст." (Мінск, 1998), "Язык и социум" (Мінск, 1998), "Беларуская мова і мовазнаўства на рубяжы III тысячагоддзя" (Мінск, 2000). Дысертацыя абмяркоўвалася на пасяджэнні аддзела беларуска–рускіх моўных сувязей Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


**Апублікаванасць вынікаў**. Вынікі дысертацыйнага даследавання апублікаваны ў 12 работах аб'ёмам 41 с., у тым ліку ў 3 навуковых артыкулах (у рэцэнзуемых часопісах) і 9 зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый.

**Структура і аб'ём**. Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, спісу літаратуры (164 адзінкі), аднаго дадатку. Асноўны тэкст выкладзены на 106 с. Агульны аб'ём дысертацыі – 125 с.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва **ўводзінах** абгрунтоўваецца выбар тэмы, яе актуальнасць, фармулююцца мэты і задачы даследавання, вызначаецца навуковая навізна і практычная вартасць, характарызуюцца асноўныя напрамкі дысертацыйнага даследавання.

**Глава I** "*Нулявая суфіксацыя ў сістэме і ў тэксце*" складаецца з трох раздзелаў.

У раздзеле 1.1. "*Праблема нулявой суфіксацыі ў лінгвістычных даследаваннях*" паказана развіццё навуковай думкі па праблеме нулявой суфіксацыі, аналізуецца лінгвістычны статус нульсуфіксальных назоўнікаў.

Нульсуфіксальны спосаб словаўтварэння аб'ядноўвае лексічныя адзінкі, утвораныя без матэрыяльна выражанага словаўтваральнага фарманта. Гэтым фактам у значнай ступені абумоўлены разыходжанні навукоўцаў пры вызначэнні паняцця "нулявая суфіксацыя". Названы спосаб утварэння назоўнікаў В.У. Вінаградаў вызначаў як "фанетыка-марфалагічны", распаўсюджанымі пэўны час былі тэрміны: "бязафіксны тып словаўтварэння" (М.М. Шанскі), "бяссуфіксны спосаб" (М.А. Крылоў, З.Б. Варановіч). Прыводзяцца дыскусійныя меркаванні адносна паняцця "нулявая суфіксацыя" А.С. Кубраковай, У.У. Лапаціна, М. Докуліла, І.А. Смірніцкага, А.Я. Міхневіча, Н. Пышкалы і інш. У выніку аналізу лінгвістычнай літаратуры абгрунтоўваецца выбар вызначэння названага спосабу словаўтварэння як спосабу, пры якім "...дэрывацыйнае значэнне выражаецца з дапамогай нулявога суфікса"[1]. Параўн.: "Нульсуфіксальны спосаб – гэта разнавіднасць суфіксацыі, т.зв. нулявая суфіксацыя"[2].

У раздзеле 1.2. "*Да пытання сутнасці словаўтваральнага тыпу*" даследуецца сутнасць нульсуфіксальнага тыпу словаўтварэння назоўнікаў у розных славянскіх мовах. Тыпы назоўнікаў, якія разглядаюцца ў межах нулявой суфіксацыі, амаль поўнасцю супадаюць у беларускай і рускай мовах, пра што сведчаць матэрыялы адпаведных акадэмічных граматык, вучэбных дапаможнікаў. Ва ўкраінскай мове шэраг тыпаў назоўнікаў (назоўнікі, што абазначаюць назвы асоб жаночага полу, суадносных з мужчынскімі, некаторыя адпаведнікі да мужчынскіх прозвішчаў, аддзеяслоўныя назоўнікі з абстрактным і канкрэтным значэннем, назоўнікі, што абазначаюць асобу), у

---

[1] Современный русский язык / Под ред. В.А. Белошапковой. – М., 1989. – С. 203.
[2] Беларуская граматыка: У 2-х ч. – Мн., 1985. – Ч. I. – С. 212.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


склад якіх уваходзіць флексія, адносяцца да флектыўнага спосабу. У польскай мове нульсуфіксальныя ўтварэнні (парадыгматычныя дэрываты) разглядаюцца ў межах парадыгматычнай дэрывацыі, якая ўключае ў сябе шырокае кола словаўтваральных з'яў. У выніку зроблены вывад аб мэтазгоднасці ўключэння ў сферу нульсуфіксальнага тыпу словаўтварэння назоўнікаў ад'ектыўнага скланення, утвораных ад прыметнікаў тыпу: *малады, хворы, прыёмная, слясарная, заліўное, бабовы, адпускныя, кантрольная, служачы, мінулае, Ягаднае, Буланы.*

У раздзеле 1.3. "*Функцыянаванне нульсуфіксальных наватвораў у сучасным пісьмовым маўленні*" разглядаюцца асаблівасці ўжывання ў сучасным перыядычным друку, мастацкіх тэкстах нульсуфіксальных назоўнікаў, якія яшчэ не сталі узуальнымі, але вызначаюцца высокай частотнасцю выкарыстання.

1. У сродках масавай інфармацыі, мастацкіх тэкстах карыстальнікамі беларускай мовы даволі паслядоўна ўжываюцца лексемы *выстава, аповед, сумнеў, выступ, спадзеў, супрацiў.*

Высокай частотнасцю ўжывання вызначаецца лексема *выстава.* У свой час вакол названай лексічнай адзінкі разгарнулася дыскусія наконт права на функцыянаванне яе ў мове. Так, на думку прафесара П. Сцяцко слова *выстава* ўзнікла "паводле прадуктыўнай у беларускай мове мадэлі"[1], а выкладчык з Полацка Б. Пятровіч на падставе аналізу сістэмы ўтварэння слоў з прэфіксам **вы-**, зрабіў заключэнне што "…выстава – канкурэнт выстаўкі. Безнадзейны."[2]. Зараз трэба канстатаваць той факт, што назоўнік *выстаўка* перайшоў у пасіўную пазіцыю, яго ўжыванне ў маўленні зафіксавана ў адзінкавых выпадках, а *выстава* кваліфікуецца большасцю лінгвістаў як запазычанне з польскай мовы. Напрыклад, А.А. Лукашанец лічыць, што "ўключэнне запазычання *выстава,* як і некаторых іншых лексічных адзінак, у сістэму сінхроннага словаўтварэння беларускай мовы абумоўлена ўваходжаннем яго ў словаўтваральнае гняздо дзеяслова *выставіць/выстаўляць,* што ў рэшце рэшт і патрабуе яго словаўтваральнай інтэрпрэтацыі"[3]. Як факт словаўтваральнай сістэмы беларускай мовы назоўнік *выстава* зараз зафіксаваны ў "Словаўтваральным слоўніку беларускай мовы" (2000 г.).

Трывала замацаваўся на старонках газет, часопісаў назоўнік *аповед.* Ім карыстаюцца аўтары рознага ўзросту, з рознымі поглядамі на сацыяльныя, культурныя і моўныя працэсы. Назіранні паказваюць, што згаданая лексема ўсё актыўней выцясняе суфіксальны сінонім са старонак мастацкіх твораў: *Яна слухала яго* ***аповеды*** *і не слухала, бо сэрца ўсё яшчэ заставалася там, каля сына.* (Л. Арабей. Горкія ягады); *Герой нашага* ***аповеду*** *Іван Баранкевіч вернуты з небыцця, зразумела, не толькі за тое, што ўслаўляў Ільіча.* (Васіль Берднік. Пісаў пра Леніна, перакладаў Коласа); *Скончыўшы* ***аповед*** *пра сваіх малалетніх геніяў алоўка і пэндзля, Вольга вывела да мікрафона хлопца з*

---

[1] П.У. Сцяцко. Пра выставу і сметанковае масла // Роднае слова. – 1992. – № 6. – С. 56.
[2] Б. Пятровіч. Выстава: што за слова // Роднае слова. – 1993. – № 11. – С. 32.
[3] Беларуская мова. – Opole, 1998. – С.185.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ


**Артыкулы:**

1. Кандраценя І.У.Марфаналогія нульсуфіксальнага ўтварэння ў беларускай мове // Бел. лінгвістыка. – 1995. – Вып. 45. – С. 44 – 48.
2. Кандраценя І.У. Праблема нулявой суфіксацыі ў лінгвістычных даследаваннях // Бел. лінгвістыка. – 1996. – Вып. 46. – С. 32 – 37.
3. Кандраценя І.У. Аспектуальнасць і нульсуфіксальнае словаўтварэнне назоўнікаў // Бел. лінгвістыка. – 2001. – Вып. 50. – С. 69 – 73.

**Матэрыялы канферэнцый:**

4. Кандраценя І.У. Да пытання нульсуфіксальнага ўтварэння назоўнікаў у беларускай і рускай мовах // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства. Матэрыялы Трэцяй міжнар. навук. канф., Віцебск, 5 – 7 снежня 1994 г. – Віцебск, 1994. – Ч.1. – С. 110 – 111.
5. Кандраценя І.У. Да пытання ўтварэння прэфіксальна-суфіксальных назоўнікаў у блізкароднасных мовах // Единство восточнославянских народов: прошлое, настоящее, перспективы: Материалы науч. конф. – Гомель, 1995. – С. 187 – 188.
6. Кандраценя І.У. Нулявая суфіксацыя ў сучаснай беларускай мове // Словообразование и номинативная деривация в славянских языках: Материалы V респ. научн. конф., посв. памяти проф. В.М. Никитевича. – Гродно, 1996. – С. 167 – 169.
7. Кандраценя І.У. Нульсуфіксальныя назоўнікі: перспектывы даследавання // Язык и социум: Материалы II междунар. науч. конф. 5 – 6 декабря 1996 г. – Мн., 1998. – Ч. II. – С. 115 – 120.
8. Кандраценя І.У. Нулявая суфіксацыя ў сістэме сучаснага беларускага словаўтварэння // Беларуская мова ў другой палове XX стагоддзя. Матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 22 – 24 кастрычніка 1997 г. – Мінск, 1998. – С. 113 – 115.
9. Кандраценя І.У. Асаблівасці ўжывання нульсуфіксальных назоўнікаў // Матэрыялы міжнар. навук. канф. “Мова – Літаратура – Культура”, прысв. 55-годдзю адкрыцця кафедры беларускай мовы і літаратуры БДУ. – Мн., 1999. – С. 68 – 69.
10. Кандраценя І.У. Прэфіксальныя назоўнікі з нулявым суфіксам у рускай і беларускай мовах // Беларуская мова і мовазнаўства на рубяжы III тысячагоддзя: Матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 70-годдзю Ін-та мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі, 2 –3 лістапада 1999 г. – Мн., 2000. – С. 76 – 78.

**Тэзісы дакладаў:**

11. Кандраценя І.У. Нульсуфіксальныя назоўнікі ва ўсходнеславянскіх і польскай мовах // Беларуская і руская мовы ў Беларусі: праблемы

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

функцыянавання і ўзаемадзеяння: Тэз. дакл. навук. канф., прысв. 20-годдзю аддзела беларуска-рускіх моўных сувязей. – Мн., 1997. – С. 35 – 36.

12. Кондратеня И.В. Отглагольные существительные с нулевым суффиксом в русском и белорусском языках (сходства и различия словообразования) // Проблемы изучения и преподавания русского языка в вузах и школах республики: Тез. докл. научно-метод. конф., Минск, 20 – 22 мая 1992 г. – Мн., 1992. – Ч. 1. – С. 147 – 148.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ




## РЭЗЮМЭ

**Кандрацeня Ірына Уладзіміраўна**

**Нулявая суфіксацыя ў сістэме беларускага словаўтварэння**

**Ключавыя словы:** нульсуфіксальны назоўнік, матывацыйныя адносіны, словаўтваральны фармант, лексічнае значэнне, словаўтваральнае значэнне, семантычная суаднесенасць, матываванае слова, матывавальнае слова, класіфікацыйная граматычная катэгорыя, марфаналагічныя працэсы.

**Аб'ект даследавання:** назоўнікі, утвораныя нульсуфіксальным спосабам.

**Прадмет даследавання:** матывацыйныя адносіны паміж дзеясловам і нульсуфіксальным назоўнікам.

**Мэта даследавання** – вызначыць лінгвістычную сутнасць нулявой суфіксацыі з улікам апошніх даследаванняў, апісаць заканамернасці матывацыйных адносін паміж членамі словаўтваральных пар для ўстанаўлення межаў нульсуфіксальнага тыпу ўтварэння назоўнікаў.

**Метады даследавання**: даследаванне праведзена на падставе апісальнага і супастаўляльнага метадаў. Методыка даследавання заключаецца ў сумяшчэнні некалькіх відаў аналізу: словаўтваральнага, дэфініцыйнага (лексікаграфічнае апісанне матываваных слоў), праводзяцца аналогіі паміж дэрывацыйнымі мадэлямі. У рабоце выкарыстаны элементы колькаснага падліку.

**Навуковая навізна** вызначаецца тым, што ўпершыню зроблена супастаўленне семантычнага аб'ёму матывавальнага і матываванага слоў, выяўлены ўплыў катэгорыі трывання на семантыку аддзеяслоўных нульсуфіксальных назоўнікаў, устаноўлены сістэмныя абмежаванні для ўтварэння нульсуфіксальных назоўнікаў, зроблена поўнае апісанне марфаналагічных працэсаў нульсуфіксальнага спосабу словаўтварэння.

**Практычная значнасць** атрыманых вынікаў заключаецца ў тым, што матэрыялы даследавання і яго вынікі могуць быць выкарыстаны ў ВНУ пры выкладанні раздзела "Словаўтварэнне", пры распрацоўцы спецкурсаў і спецсемінараў, у лексікаграфічнай практыцы. Прынцыпы апісання матывацыйных адносін могуць быць выкарыстаны навукоўцамі пры даследаванні іншых словаўтваральных тыпаў.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


# РЕЗЮМЕ

**Кондратеня Ирина Владимировна**

**Нулевая суффиксация в системе белорусского словообразования**

**Ключевые слова:** нульсуффиксальное имя существительное, мотивационные отношения, словообразовательный формант, лексическое значение, словообразовательное значение, семантическое соотношение, мотивирующее слово, мотивированное слово, классификационная грамматическая категория, морфонологические процессы.

**Объект исследования:** имена существительные, образованные нульсуффиксальным способом.

**Предмет исследования:** мотивационные отношения между глаголом и нульсуффиксальным именем существительным.

**Цель исследования** – определить лингвистическую сущность нулевой суффиксации с учетом последних исследований, описать закономерности мотивационных отношений между членами словообразовательных пар для установления границ нульсуффиксального типа образования имен существительных.

**Методы исследования**: исследование проведено на основе описательного и сопоставительного методов. Методика исследования заключается в совмещении нескольких видов анализа: словообразовательного, дефиниционного (лексикографическое описание мотивированных слов), проводятся аналогии между деривационными моделями. В работе использованы элементы количественного подсчета.

**Научная новизна** определяется тем, что впервые проведено сопоставление семантического объема мотивирующего и мотивированного слов, выявлено влияние категории вида на семантику отглагольных нульсуффиксальных имен существительных, установлены системные ограничения для образования нульсуффиксальных имен существительных, сделано полное описание морфонологических процессов нульсуффиксального способа словообразования.

**Практическая значимость** полученных результатов заключается в том, что материалы исследования и его результаты могут быть использованы в вузовской практике при преподавании раздела “Словообразование”, при разработке спецкурсов и спецсеминаров, в лексикографической практике. Принципы описания мотивационных отношений могут быть использованы лингвистами при исследовании других словообразовательных типов.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ




## SUMMARY

**Kandratsenya Irina**

**Zero suffixation in the system of Belarusian word-formation**

**Keywords**: zero suffixal noun, motivated relations, word-formative formant, lexical meaning, word-formative meaning, semantic relationship, motivating word, motivated word, classificational grammatical category, morphonological processes.

**The object of research:** nouns formed by means of zero suffixation.

**The subject of research:** motivated relations between verb and zero suffixal noun.

**The aim of research** – to define the linguistic essence of zero suffixation in view of resent researches, to describe the regularities of motivated relations between the members of word-formative pairs for determining the borders of zero suffixal type of noun formation.

**The methods of research**: the research is carried out on the basis of descriptive and comparative methods. The principles of research consist in combining several types of analysis: derivational, definitive (lexicographic description of motivated words), analogies between derivational patterns are conducted. Elements of quantitative calculation are used in the work.

**Scientific novelty of research** is determined by the fact that comparison of semantic volume of motivating and motivated words is carried out for the first time, influence of the category of aspect on the semantics of verbal zero suffixal nouns is revealed, some restrictions for the formation of zero suffixal nouns are established, complete description of morphnological processes of zero suffixation is made.

**Practical value** of the received results is that the materials of research and its results can be used in high school practice in teaching "Word-formation", in the development of special courses and seminars, in lexicographic practice. The principles of the description of motivated relations can be used by linguists researching other word-formation types.


---


Подписано в печать 19.11.03. Формат 69х84 1/16. Усл.печ.л. 1,1 Уч.изд.л. 1,1
Тираж 100 экз. Бумага офсетная. Гарнитура Roman. Заказ № 1190
ИООО "Право и экономика". Лиц. ЛВ № 44 от 15.09.2000. 220072 Минск Сурганова, 1, корп. 2.
Отпечатано с оригинал-макета заказчика ООО "ДИРА" Лиц. ЛП № 273 от 12.02.03. 220050 Минск Смолячкова 9.


*20504246*